# Прыняць Хрыста як Валадара і Пана

Аўтар: Кінга Красіцкая
26.11.2017 00:00



26 лістапада каталіцкі Касцёл адзначае апошнюю нядзелю літургічнага года. Яго падсумаваннем становіцца ўрачыстасць Езуса Хрыста, Валадара Сусвету, які пануе ў Небе і на зямлі. Св. Амброзій навучаў, што там, дзе ёсць Хрыстос, там ёсць жыццё і Яго Валадарства. Збаўца – Цар людскіх сэрцаў.

Моцай сваёй ласкі Ён робіць так, што кляймо нашага эгаізму, ляноты, недахопу розуму ці добрай волі становіцца сцяблом ружы. З гісторыі ўстанаўлення ўрачыстасці

Свята Езуса Хрыста, Валадара Сусвету, увёў у літургічны каляндар у 1925 годзе папа Пій XI сваёй энцыклікай “Quas Primas”, прыгадваючы такім чынам аб месцы, якое належыць Пану Езусу ў жыцці чалавека, грамадстваў і краін. “Хрыстос валадарыць у свядомасці людзей – не столькі таму, што мае глыбокі розум і вялізныя веды, колькі таму, што Ён сам з’яўляецца Праўдай, а чалавек павінен зачарпнуць праўды ад Яго і паслухмяна яе прыняць. Гаворыцца, што Ён валадарыць таксама ў волі людзей – не столькі таму, што бездакорная чалавечая воля поўнасцю падпарадкоўваецца найсвяцейшай Божай волі і слухаецца яе, але таму, што Ён нашу вольную волю схіляе і сваім натхненнем яе падпарадкоўвае, каб мы запаліліся да самых высакародных учынкаў. Урэшце, Хрыстос з’яўляецца Валадаром сэрцаў – па прычыне сваёй любові, якая пераўзыходзіць навуку, па прычыне лагоднасці і асалоды, якія прыцягваюць да сябе душы; таму што не было і не будзе нікога, хто быў бы так любімы ўсімі, як Езус Хрыстус”, – занатавана ў энцыкліцы Папы. † Святы Айцец наказаў, каб ва ўсіх касцёлах у апошнюю нядзелю перад Адвэнтам пасля галоўнага набажэнства перад выстаўленым Найсвяцейшым Сакрамантам адгаворваліся літанія да Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса і Акт прысвячэння людскога роду Яго Найсвяцейшаму Сэрцу. Устанаўленне ўрачыстасці на гэты дзень звязана з біблійным разуменнем часу, што, разам з тым, перадае сэнс літургічнага года, які мае на мэце прыгадаць вернікам найважнейшыя падзеі ў гісторыі Збаўлення.

Езус валадарыць з вышыні крыжа

У выяўленчым мастацтве ўжо са старажытнасці Хрыста прадстаўляюць як Усеўладара, што сядзіць на троне, а на Зямлю, як на падножку, апірае ногі або трымае Зямны шар у далоні. Так адлюстроўвалі Езуса даўнія іконы і мазаікі. Так Яго неаднаразова паказвае і Апакаліпсіс: Хрыстос сядзіць на троне, а ўсё стварэнне пакланяецца Яму.

Евангеллі дэманструюць іншае вымярэнне панавання Божага Сына – Ён валадарыць з

вышыні крыжа.

У ментальнасці тагачасных людзей Езус быў лідарам збунтаваных яўрэяў. Аднак не тое было галоўным для нашага Збаўцы. Збіты, з цярновым вянком на галаве Ён сказаў Понцію Пілату: “Валадарства Маё не адгэтуль” (параўн.: Ян 18, 33–40).

На крыжы Хрыста віднеўся надпіс: “Езус Назаранін, кароль Юдэйскі” (Ян 19, 19). Гэтыя словы чыталі тлумы людзей: члены Высокай Рады, жаўнеры, пасіўныя сведкі і інш. Бачыла іх і Марыя. Аднак тое, што Яго каты планавалі як пакаранне і прыніжэнне, стала знакам моцы і панавання. Змучаны і пакутуючы Месія ў акце абсалютнай Ахвяры паказаў моц хвалы і веліч справы збаўлення чалавека. Праз смерць на крыжы даказаў сваю любоў да ўсіх людзей, адкупіў іх грахі і паяднаў з Айцом.

Назіраем, як нават зло можа паслужыць дабру: “Закон жа ўвайшоў, каб памножыўся грэх. А дзе памножыўся грэх, там яшчэ больш памножылася ласка; каб як грэх запанаваў з прычыны смерці, так і ласка запанавала праз справядлівасць дзеля жыцця вечнага праз Езуса Хрыста, Пана нашага” (Рым 5, 20–21).

Адзіная надзея

Урачыстасць Езуса Хрыста, Валадара Сусвету, звяртае ўвагу на канчатковую мэту чалавечага жыцця – з’яднацца з Богам і аддацца пад панаванне Любові ў Яго Валадарстве. Там не кіруюць людскімі правамі, бо яно збудавана не на зямных структурах, але на трывалым фундаменце любові і моцы Святога Духа. У ім не навязваецца свая воля і ўлада, не выкарыстоўваюць іншых для ўласнай выгады. Там цярпліва чакаюць кожнага, хто па ўласным жаданні ў пакоры наблізіцца да Бога, каб зачарпнуць з крыніцы Збаўлення.

Наша штодзённае жыццё павінна быць нястомным падпарадкоўваннем Збаўцы. Толькі Ён можа дапамагчы вызваліцца з-пад улады грахоў, самалюбства, амбіцый і жаданняў. З вышыні крыжа Хрыстос прагне супакоіць наш боль, вылечыць параненыя сэрцы, суцешыць і прытуліць іх да сваіх збаўчых ран.



Урачыстасць Езуса Хрыста, Валадара Сусвету, прыпадае дакладна на XXXIV Звычайную Нядзелю, якая адначасова з’яўляецца апошняй нядзеляй літургічнага года. Вернікі прыходзяць у святыню, каб паўдзельнічаць у св. Імшы, выслухаць Божае слова і прыняць

Хрыста ў Камуніі пад выглядам Хлеба. Гэтая рэчаіснасць набывае асабліва ўзвышаны характар, таму што ўзгадваем Сына Божага, які для нашага збаўлення нарадзіўся ў чалавечым целе, памёр і ўваскрос, Валадара людскіх розумаў, волі і сэрца.

Урачыстасць Езуса Хрыста, Валадара Сусвету, адносна “маладая”. Тым не менш, яе змест паходзіць з Біблii, а дакладней – з Евангелля, дзе сам Хрыстос гаворыць пра сябе, што Ён, Сын Чалавечы, прыйдзе “ў славе сваёй і ўсе анёлы з Ім, тады сядзе на троне славы сваёй. І сабраныя будуць перад Ім усе народы, і Ён аддзеліць адных ад другіх, як пастух аддзяляе авечак ад казлоў” (Мц 25, 31–32).

Гэтая ўрачыстасць нагадвае тым, хто верыць у Хрыста, што Ён – Пан і Валадар усяго свету, Бог-Чалавек, Стварыцель і Адкупіцель чалавецтва. І хоць Езус мог прэтэндаваць на тытул зямнога караля Ізраіля, бо паходзіў з дому і роду Давіда, юдэйскага цара, Яго Валадарства не з гэтага свету. Яно пераўзыходзіць зямныя каралеўствы, аднак распачынаецца на зямлі – у сэрцах вернікаў, у хрысціянскіх супольнасцях, сярод тых, хто жыве паводле Божых запаведзей і евангельскай навукі Хрыста. Заданнем кожнага, хто лічыць сябе вучнем Пана, з’яўляецца пашырэнне Божага Валадарства на зямлі праз асабістае сведчанне хрысціянскага жыцця, здзяйсненне добрых учынкаў.

---



Ужо на працягу многіх гадоў Урачыстасць Езуса Хрыста, Валадара Сусвету, у супольнасці Гродзенскай вышэйшай духоўнай семінарыі з’яўляецца асаблівым часам. Гэты дзень у нашай дыяцэзіі называецца “семінарыйнай нядзеляй”. Выхаваўцы і алюмны выязджаюць у розныя парафіі дыяцэзіі, каб даваць сведчанне сваёй веры і свайго паклікання. Такім чынам мы можам, у пэўным сэнсе, “зрабіць рэкламу” духоўнай семінарыі, наблізіць яе жыццё і паказаць, што надалей, не зважаючы на крызіс каштоўнасцей у сучасным свеце, на крызіс пакліканняў, ёсць маладыя людзі, гатовыя пазітыўна адказаць на запрашэнне Хрыста і пайсці за Ім.

Гэтая ўрачыстасць, звязаныя з ёй выезды і спатканні дазваляюць семінарыстам сустрэцца з моладдзю, міністрантамі, каб прадэманстраваць, як можна ў радасці і разам з Хрыстом перажываць найпрыгажэйшы этап свайго жыцця – маладосць. Паказаць, што алюмны – гэта не сумныя людзі, а асобы, напоўненыя жыццёвай энергіяй, крыніцай якой з’яўляецца сам Езус.

Ад імя супольнасці Вышэйшай духоўнай семінарыі ў Гродне хочацца асаблівым чынам падзякаваць у гэты дзень усім вернікам нашай дыяцэзіі за малітоўную і матэрыяльную

падтрымку, якую яны аказваюць навучальнай установе. Гэта Ваш асабісты ўклад у будучыню Касцёла ў нашай краіне і ў развіццё паклікання заўтрашніх святароў, якія будуць служыць побач з Вамі. Няхай Хрыстос, Валадар Сусвету, адорыць усіх сваім бласлаўленнем, дарамі і ласкамі, патрэбнымі ў штодзённым жыцці. Семінарыйная супольнасць памятае пра кожнага з Вас у сваіх малітвах.